УДК 271.2(476.4)”1897/1898”

# АДКРЫЦЦЁ Ў ГОРАДЗЕ МСЦІСЛАВЕ АДДЗЯЛЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ЦАРКОЎНА-ПРАВАСЛАЎНАГА БАГАЯЎЛЕНСКАГА БРАЦТВА

**Асіпцова Яраслава Аляксандраўна**
Мсціслаўскі раённы гісторыка-археалагічны музей (г. Мсціслаў, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны адкрыццю ў горадзе Мсціславе аддзялення Магілёўскага царкоўна-праваслаўнага Багаяўленскага брацтва.*

Важную ролю ў абароне інтарэсаў праваслаўных жыхароў гарадоў выступалі царкоўныя брацтвы, якія ўзніклі ў другой палове XVI стагоддзя. Царкоўныя брацтвы дзейнічалі ў розных гарадах Беларусі, у тым ліку ў горадзе Мсціславе.

У 1897 годзе ў горадзе Мсціславе ўзнікла ідэя адкрыцця мясцовага аддзялення Магілёўскага царкоўна-праваслаўнага Багаяўленскага брацтва: «В минувшем 1897 году, в г. Мстиславле возникла настойчивая мысль об открытии местного Отделения Могилевского Церковно-Православного Богоявленского Братства» [2, с. 148; 3, с. 12]. Дадзеная прапанова была ўспрынята станоўча.

У гэты час пачалася праца па складанню Статута брацтва, вызначэнню круга членаў-заснавальнікаў у колькасці 67 чалавек. 23 снежня 1897 года быў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

абраны склад кіравання. У яго ўвайшло 7 чалавек. Старшынёй кіравання быў абраны архімандрыт Анатоль, які з'яўляўся былым настаяцелем Пустынскага Свята-Успенскага мужчынскага манастыра: «…должностными лицами избраны: председателем – архимандрит Анатолий, его помощником – Н. Н. Мещерский, казначеем – Ив. Иуст. Вербицкий и делопроизводителем – священник П. Курневич» [2, с. 148]. Усе братчыкі дзяліліся на чатыры катэгорыі: ганаровых, пажыццёвых, сапраўдных і членаў-спаборніцтва. Наогул, членам брацтва магла стаць любая асоба праваслаўнага веравызнання [1, с. 8–9].

Што датычыцца Статута аддзялення магілёўскага царкоўна-праваслаўнага Багаяўленскага брацтва, ён быў зацверджаны 8 лютага 1898 года біскупам Магілёўскім і Мсціслаўскім Місаілам: «8 февраля Устав Мстиславского Отделения получил надлежащее свое утверждение, сопровождаемое со стороны Архипастыря молитвенным желанием новому учреждению плодотворных успехов во Славу Божию и на пользу Могилевской Епархии, а 28 февраля, по отпечатании в значительном количестве экземпляров, Устав этот был прислан в Мстиславль» [2, с. 148–149].

Статут складаўся з 5 частак: 1. мэта аддзялення брацтва; 2. дзейнасць аддзялення; 3. сродкі аддзялення; 4. склад аддзялення; 5. кіраванне мсціслаўскага аддзялення брацтва. Галоўнай мэтай аддзялення Магілёўскага царкоўна-праваслаўнага Багаяўленская брацтва было дасягненне тых жа мэт, якія былі пакладзены ў аснову Магілёўскага Багаяўленская брацтва: «Мстиславское отделение могилевского церковного братства открывается в городе Мстиславле для более успешного достижения тех же целей какие положены в основу названного Братства, т.е. духовно-нравственной и христиански-благотворительной» [5, с. 1].

Дзеля дасягнення мэты, Мсціслаўскае аддзяленне Магілёўскага царкоўна-праваслаўнага Багаяўленскае брацтва ажыццяўляла рознага роду мерапрыемствы. Напрыклад, адкрыццё ў горадзе Мсціславе бібліятэк, складу духоўна-маральнай літаратуры, брашур і царкоўных прадметаў (крыжыкі, абразкі, карціны і інш.): «Для выполнения указанных целей Отделение Братства заботится: а) об учреждении и благоустройстве библиотеки в г. Мстиславле для безплатной выдачи на дом книг для чтения преимущественно религиозно-нравственного содержания, об устройстве безплатной читальни для приходящих (для библиотеки и читальни имеют быть составлены особые правила) и об открытии для безплатного чтения библиотек (постоянных или передвижны) при организованных церковно-приходских школах всего уезда; б) об открытии по мере надобности и средств в г. Мстиславле склада книг, брошюр, листов духовно-нравственного содержания, икон, крестиков, картин и других предметов религиозно-исторического характера…» [4, с. 121; 5, с. 2]. Таксама ажыццяўлялася арганізацыя царкоўных хораў з аматараў царкоўных спеваў; наладжванне народных чытанняў рэлігійна-маральнага, гістарычнага, патрыятычнага і сельскагаспадарчага зместу; аказванне матэрыяльнай дапамогі, якія маюць у гэтым патрэбу (бедныя, хворыя і г.д.). Акрамя таго, у Статуце Мсціслаўскага аддзялення Магілёўскага Багаяўленскага брацтва звярталася ўвага на правядзенне місіянерскіх гутарак з габрэямі: «…а равно



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

заботится о ведении публичных собеседований с местным еврейством о заблуждениях талмудического учения и о непреложной истинности христианского православного вероучения…» [5, с. 2].

Урачыстае адкрыццё Мсціслаўскага аддзялення Магілёўскага брацтва адбылося 8 сакавіка 1898 г.: «На 8 марта назначено было и открытие Отделения, для чего члены – учредители, духовенство и все учреждения были оповещены особыми повестками, а кроме того городское духовенство озаботилось заблаговременно познакомить с задачами Отделения и своих прихожан» [2, с. 149].

На адкрыцці мсціслаўскага аддзялення Магілёўскага Багаяўленскага брацтва прысутнічалі: архімандрыт Анатоль, духавенства, братчыкі, прадстаўнікі гарадскога кіравання, ўсіх гарадскіх устаноў і праваслаўнае насельніцтва горада Мсціслава.

Адкрыццё аддзялення суправаджалася малітвай, літургіяй, прамовай архімандрыта Анатоля да прысутных, царкоўнымі спевамі двух хораў (хоры духоўнага і гарадскога вучылішча), азнаямленнем са зместам зацверджаннага Статута аддзялення, азначэннем падстаў для адкрыцця аддзялення, пажаданнямі братчыкам у іх працы па ажыццяўленню задач аддзялення. Таксама на адкрыцці Мсціслаўскага аддзялення Магілёўскага Багаяўленскага брацтва выступіў з прамовай прадстаўнік кіравання П. Т. Залескі, які прывёў гістарычныя звесткі аб «западно-русских братствах вообще и о значении их в деле защиты православия и русской народности…» [2, с. 153].

Улічваючы абмежаванасць сродкаў, братэрскае кіраванне засяродзіла сваю актыўнасць на асветніцкай працы: «Мстиславское отделение Братства, хотя и сейчас и не располагает крупными материальными средствами, однако намеренно немедленно приступить к деятельности, преимущественно просветительной» [2, с. 155].

Такім чынам, у канцы XIX стагоддзя ў горадзе Мсціславе было адкрыта аддзяленне Магілёўскага Богаяўленскага брацтва, якое было накіравана на асветніцкую дзейнасць і умацаванне пазіцый праваслаўя на Мсціслаўшчыне.

## Літаратура

1. Восович, М. С. Культурно-просветительская деятельность Мстиславского отделения Могилевского богоявленского братства в 1898 – 1904 гг. / С. М. Восович // Вестник Брестского государственного технического университета : научно-теоретический журнал. – 2014. – № 6. – С. 8–11.

2. Курневич, П. Открытие в г. Мстиславле отделения Могилевского церковно-православного Богоявленского братства (корреспонденция) / П. Курневич // Могилевские епархиальные ведомости. – 1898. – № 10–11 (часть неофициальная). – С. 148–156.

3. Мамчиц, О. М. Детство в стенах древней обители / О. М. Мамчиц. – Могилев : Могилевская областная укрупненная типография, 2012. – 115 с.

4. Устав Мстиславского отделения Могилевского церковного Богоявленского братства // Могилевские епархиальные ведомости. – 1898. – № 10–11 (часть официальная). – С. 79–85.

5. Устав Мстиславского отделения Могилевского церковного Богоявленского братства / Могилевское церковно-православное Богоявленское братство. Мстиславское отделение. – Могилев : Типография Губернского правления, 1898. – 11 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова